УДК 94(476)«1930»

**А.А. Субоцін**

# Успрыманне стаханаўскага руху рабочымі БССР у сярэдзіне 1930-х гг.

Стаханаўскаму руху ў гістарыяграфіі быў прысвечаны шэраг грунтоўных даследаванняў, дзе ён разглядаўся пераважна ў кантэксце праблематыкі сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця СССР 1930-х гг. [1–5]. Гісторыкамі амаль не закраналіся пытанні, звязаныя з вывучэннем асаблівасцяў эмацыянальнай сферы рабочых, іх каштоўнасных арыентацый і стэрэатыпаў сацыяльных паводзін у рамках працэсу развіцця стаханаўскага руху, у той час як разгортванне гэтай формы сацыялістычнага спаборніцтва шмат у чым залежыла не толькі ад дзейнасці партыйных і дзяржаўных органаў, пэўных эканамічных умоў, але і ад характару ўспрымання рабочымі новых вобразаў герояў вытворчасці – стаханаўцаў, і стаханаўскага энтузіязму ў цэлым.

Мэтай нашага даследавання з'яўляецца вызначэнне асаблівасцяў успрымання стаханаўскага руху рабочымі БССР у сярэдзіне 1930-х гг.

Пры даследаванні праблемы ўспрымання стаханаўскага руху намі былі скарыстаны ў якасці крыніц агітацыйныя брашуры 1936 г., якія змяшчаюць у сабе выступленні асобных рабочых пра свой удзел у руху. У прамовах выступаючых адзначаліся матывы ўключэння ў стаханаўскі рух, адносіны да новых метадаў працы і да герояў-стаханаўцаў. Большасць матэрыялаў гэтых брашур носіць прапагандысцкі характар, таму і інфармацыя, прыведзеная ў іх, была пададзена ў духу ўздыму працоўнага энтузіязму ў вытворчасці. Такімі ж па змесце і характары з'яўляюцца выкарыстаныя намі выступленні пралетарыяў у газетах «Звязда» і «Рабочий» за 1935–1936 гг. Сярод неапублікаваных крыніц былі прааналізаваны дакументы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці: спецыяльныя паведамленні Віцебскага гарадскога і Полацкага акружнога камітэтаў КП(б)Б, дакладныя запіскі ЦК КП(б)Б аб разгортванні стаханаўскага руху, матэрыялы Цэнтральнага ўпраўлення прафсаюзаў гарбароў Беларусі. Адзначаныя архіўныя дакументы паказваюць праявы антыстаханаўскіх настрояў рабочых, факты сацыяльных супярэчнасцей паміж часткай рабочых і стаханаўцамі, прыводзяцца прыклады мерапрыемстваў па арганізацыі стаханаўскага руху, якія паспрыялі замацаванню ў масавай свядомасці рабочых вобразаў мясцовых герояў-стаханаўцаў.

**Адносіны да стаханаўскіх метадаў працы.** Стаханаўскі рух, які разгарнуўся з канца жніўня 1935 г., ужо ў кастрычніку гэтага ж года быў распаўсюджаны, дзякуючы намаганням мясцовых партыйных і дзяржаўных органаў, прафсаюзных арганізацый, ва ўсіх галінах прамысловасці Беларусі. Імклівае развіццё руху было абумоўлена і характарам эмацыянальных рэакцый з боку рабочых на новыя спосабы арганізацыі працы. Большасць рабочых прадпрыемстваў БССР зацікавілі метады, што скарыстаў А. Стаханаў і іншыя стаханаўцы, адсюль узнікала імкненне ўдасканаліць працу свайго тэхнічнага абсталявання, каб павысіць прадукцыйнасць вытворчасці. Рабочы-

апаратчык І. Трацэўскі з Рудабельскага спіртзавода (Глускі раён) сцвярджаў: «Однажды на занятиях политрук нам прочитал статью о том, как Алексей Стаханов организовал работу по-новому, перекрыл в несколько раз существующие нормы. У меня зародилась мысль перекрыть мощность нашего аппарата» [6]. У выніку рабочы стаў звяртаць увагу на асаблівасці эксплуатацыі тэхнікі, на якой працаваў ён, і на аснове свайго назірання і ўласнага вопыту перакрыў тэхнічную магутнасць апарата, выпрацаваўшы замест усталяванай нормы ў 220 дэкалітраў спірту 422,1 дэкалітра [6, с. 29].

Такое стаўленне да стаханаўскіх метадаў працоўнай дзейнасці тлумачыцца спецыфікай сістэмы каштоўнасцей, якая існавала ў рабочым асяроддзі, а менавіта такімі яе характэрнымі рысамі, як зацікаўленасць у выніках сваёй працы, жаданне прымяніць новыя ўдасканаленыя спосабы эксплуатацыі тэхнікі. Напрыклад, работніца з Барысаўскай запалкавай фабрыкі Я. Дзеравяга адзначала: «Яшчэ даўно хацелася мне перайсці працаваць на пяці машынах, але ўсё не адважвалася, і толькі стук малатка Стаханава ўзбудзіў у мяне новы ўздым да работы» [7]. Асабліва адзначаныя вышэй каштоўнасці рабочых праявіліся пры ўспрыманні стаханаўскага руху ўдарнікамі, якія ўжо ў першай і пачатку другой пяцігодкі паказалі прыклады павышэння прадукцыйнасці працы, і для якіх рух стаў новым стымулам далейшага паляпшэння працоўнай дзейнасці. Ударнік з механічнага цэха Мінскага станкабудаўнічага завода імя Кірава Ш. Шульман, калі на гэтым прадпрыемстве разгарнуўся стаханаўскі рух, так выказаўся наконт далейшых магчымасцей сваёй працы: «Працуючы на сваім станку, мне прыходзілася паступова змяніць тэхналагічныя працэсы і да таго, як стаханаўскі рух пачаў шырока развівацца па нашай краіне… Я думаю, што ў гэтай рабоце можна яшчэ больш удасканаліцца» [7, с. 25–26]. Такія ж матывы да ўдасканалення метадаў уласнай працы праявіла і ўдарніца-дражджаварка С. Ждановіч з Каўгарскага спіртазавода. Так, яна ўспамінае: «Меня, как лучшую ударницу, посылают на Уречский спиртзавод на совещание. Обсуждался вопрос о переводе работы спиртзавода на стахановские методы. На совещании много говорили о перестройке работы. Крепко задумалась и я. Мысли роем неслись в голове. Как помочь стахановскому движению, как стать стахановкой: вот какие вопросы не оставляли меня ни днем, ни ночью» [6, с. 42].

**Успрыманне рабочымі вобразаў стаханаўцаў.** Важную ролю ў разгортванні стаханаўскага руху адыграла стварэнне савецкай прапагандай новых вобразаў герояў вытворчасці – стаханаўцаў. Такія перадавікі, як Стаханаў, Бусыгін, Сметанін і іншыя, выступалі прыкладамі таго, што звычайны рабочы, дзякуючы сваім працоўным дасягненням, можа стаць сапраўдным героем не толькі на сваім прадпрыемстве, але і ў СССР у цэлым. Безумоўна, такія вобразы натхнялі рабочых на ўдасканаленне сваёй працы, а ў масавай свядомасці ўзнікала пэўнае захапленне вобразамі герояў-стаханаўцаў (на такі характар успрымання вобразаў стаханаўцаў паўплывала даволі развітая сістэма феномену гераізму ў штодзённай культуры таго часу, якая ўжо праявіла сябе ў вобразах герояў Грамадзянскай вайны, герояў-лётчыкаў, «папанінцаў». «чэлюскінцаў» і іншых), усталяваныя рэкорды ўяўляліся як нейкія незвычайныя ці недасягаемыя факты ў сферы вытворчасці. Адна з работніц у размове з першым сакратаром ЦК КП(б)Б М. Гікалам так выказалася наконт гэтага: «Праз некаторы час даведаліся мы таксама пра Стаханава. Спачатку не верылі. Няўжо адзін чалавек столькі можа выпрацаваць?» [8]. Вобразы ўсесаюзнавядомых стаханаўцаў успрымаліся рабочымі ў якасці эталонаў дасканалай працы і метады, якія яны выкарыстоўвалі, выступалі самымі прымальнымі. Напрыклад, рабочы Р. Рушко, які стаў у выніку лепшым

стаханаўцам у лесапільнай галіне Беларусі, прачытаўшы ў газетах пра рэкорд Стаханава, марыў сустрэцца з ім асабіста і спытаць пра тое, як ён дамогся такой высокай прадукцыйнасці працы [9]. З другога боку, разам з захапленнем гераізмам стаханаўцаў рабочыя на аснове прапагандуемай ідэі, што гэтыя новыя героі былі такімі ж звычайнымі пралетарыямі, як і яны, успрымалі дасягненне такіх рэкордаў магчымым і ў сваёй уласнай працы. Работніца з фабрыкі «Камунарка» М. Цыгельніцкая адзначала: «Я задумалася над такім пытаннем: Стаханаў такі ж самы чалавек, як і я. Раз ён дасягнуў такіх высокіх паказчыкаў у шахце, чаму нельга мне, завёртчыцы, дасягнуць такой жа высокай выпрацоўкі на сваёй рабоце?» [10].

Упэўненасць беларускіх рабочых у рэальнасці ўстанаўлення рэкордаў у вытворчасці ўзмацнялася, калі і ў БССР пачалі ўзнікаць свае мясцовыя героі. Так, напрыклад, вядомымі на ўсю рэспубліку сталі Р. Рушко ў лесапіленні і І. Гунько ў кандытарскай вытворчасці, а тых рабочых, якія ўзялі прыклад з іх, сталі называць па аналогіі са стаханаўцамі рушкоўцамі [11] і гунькоўцамі [10, с. 43]. Складваецца свой спецыфічны гераізм рэгіянальнага характару, дзе вобразы стаханаўцаў рэспубліканскага ўзроўню ўздзейнічаюць больш эфектыўна на свядомасць рабочых, чым вобразы ўсесаюзнавядомых стаханаўцаў, таму што першыя паказалі, якім чынам ажыццявіліся стаханаўскія метады на прадпрыемствах рэспублікі ў асобна ўзятых галінах прамысловасці. Калі на прадпрыемствах Беларусі ўзніклі свае першыя героі-стаханаўцы, то менавіта яны сваімі прыкладамі прыводзілі да масавага ўключэння рабочых у стаханаўскі рух. Радавыя рабочыя заўважалі, як павышаецца эфектыўнасць працы іх калег-стаханаўцаў, і імкнуліся паказаць не горшыя вынікі, і, такім чынам, узнікала сапраўднае вытворчае спаборніцтва паміж прадстаўнікамі аднаго і таго ж працоўнага калектыву. На Мінскім станкабудаўнічым заводзе імя Кірава падчас адной змены пачалі спаборнічаць паміж сабой стаханавец Н. Гімпельштэйн і рабочыя з яго брыгады Грозаўскі і Левін. Вынікам гэтага стала тое, што апошнія, арыентуючыся на прыклад Гімпельштэйна, выканалі норму на 436% і 403% адпаведна [7, с. 48]. А муляр Д. Рагавы, што працаваў на будаўніцтве Аршанскага ільнокамбіната, стаў стаханаўцам, як ён сцвярджае, пад уплывам дасягненняў свайго брыгадзіра З. Верхавінава. Рагавы зазначыў: «4 января [1936 г.], работая на строительстве жилдома ИТР вместе с каменщиком-стахановцем тов. Верховиновым,… я видел, как проходила его подготовка к рекордной кладке. Посмотрев на организацию работ, организацию рабочего места и учитывая некоторые недостатки, я заявил начальнику строительства, что при соответствующей подготовке я также дам выработку не меньше тов. Верховинова» [12].

На складванне вобразаў герояў-стаханаўцаў у рамках аднаго прадпрыемства паўплывала акрамя дзяржаўнай прапаганды і актыўная дзейнасць кіраўнікоў заводаў, фабрык і камбінатаў БССР. На Магілёўскім машынабудаўнічым заводзе імя Дзімітрава па ініцыятыве адміністрацыі прозвішчы лепшых стаханаўцаў з зазначэннем працэнта выкананых імі норм былі аформлены ў мастацкай вітрыне, устаноўленай каля ўваходу на завод. Вітрына была ўпрыгожана лозунгамі і фотаздымкамі знатных людзей [13]. Кіраўніцтва скурзавода «Бальшавік» (г. Мінск) устанавіла спецыяльную дошку, дзе кожны дзень вывешваліся вынікі працы рабочых-стаханаўцаў, а таксама выпускала бюлетэні аб стаханаўскім руху на прадпрыемстве і распаўсюджвала іх па цэхах [13, ф. 283, воп. 1, спр. 674, арк. 18]. У дадатак да гэтага былі надрукаваныя фотаздымкі працоўнага дня адных з лепшых стаханаўцаў завода – Шульмана і Лапіна [13, арк. 67]. Такая арганізацыя

штодзённай працоўнай дзейнасці зацвярджала вобраз герояў вытворчасці ў якасці прыкладу для пераймання, дапаўняючы наяўнасць фактаў ажыццяўлення стаханаўцамі новых метадаў працы.

**Антыстаханаўскія настроі рабочых.** Працэс развіцця стаханаўскага руху ў сярэдзіне 1930-х гг. не быў адназначным, і паралельна з імкненнем рабочых удасканаліць метады сваёй працы, успрыманнем імі вобразаў герояў-стаханаўцаў у якасці эталонаў дасканалай працоўнай дзейнасці, у часткі рабочых узнікалі адмоўныя рэакцыі на стаханаўскі энтузіязм. Асабліва яны праявіліся, калі дзяржаўныя і партыйныя органы пры разгортванні стаханаўскага руху пачалі актыўна скарыстоўваць адміністрацыйны рэсурс з мэтай ахапіць як мага большую колькасць рабочых, не ўлічваючы пры гэтым працоўных і эканамічных магчымасцей асобных прадпрыемстваў і рэгіёнаў. Рабочыя ў такой сітуацыі адчувалі несупадзенне прапагандуемых ідэй стаханаўскага руху і рэальных умоў сваёй дзейнасці. Антыстаханаўскія настроі ў гэтым сэнсе паказалі далейшае развіццё спецыфікі непрымання ў штодзённых практыках авангардысцкіх эксперыментаў першых паслярэвалюцыйных гадоў.

Напэўна, самыя значныя праявы негатыўных рэакцый рабочых у ходзе правядзення мерапрыемстваў па пашырэнні стаханаўскага руху выявіліся ў адносінах да працы. У выніку актывізацыі адміністрацыйнага апарату па максімальным скарыстанні людскіх рэсурсаў праца для пэўнай часткі рабочых страчвала сваю каштоўнасць і бачылася як элемент пэўнага прымусу. Адна з работніц Віцебскай панчошнай фабрыкі імя Клары Цэткін заяўляла: «З нас здзекваюцца, навошта нам працаваць на 4-х машынах, у нас няма сіл, навошта нам стаханаўцы» [14]. Мелі месца незадаволенасці заканамернасцямі зніжэння расцэнак і павышэння норм выпрацоўкі, калі асобныя дасягненні стаханаўцаў пачыналі замацоўвацца як агульнадасягаемыя, што яшчэ больш адштурхоўвала рабочых ад удзелу ў руху і ўзмацняла адмоўныя адносіны да яго. Такія настроі, напрыклад, былі распаўсюджаны на Віцебскай ільнопрадзільнай фабрыцы «Дзвіна». Адзін з рабочых рамонтнай майстэрні гэтага прадпрыемства казаў: «Пачні толькі працаваць па стаханаўскаму метаду, і не паспееш павялічыць колькасць адзінак, як хранаметрыст зараз жа павялічыць норму і панізіць расцэнкі» [14, арк. 57]. На скурзаводзе «Бальшавік» рабочыя Л. і М. заявілі, што іх нормы з'яўляюцца рэальнымі, і стаханаўскага руху на прадпрыемстве быць не можа [13, арк. 54].

Разглядаемае намі непрыманне стаханаўскага руху параджала ў светаразуменні рабочых і адмаўленне міфалагізаваных савецкай прапагандай вобразаў Стаханава і стаханаўцаў, калі яны ўспрымаліся не героямі працы, а з'яўляліся ўвасабленнем вобраза «чужога». Дадзены тып нагадвае вобраз «ворага», але адзначае межы «сваіх», рубяжы разумення і ідэнтычнасць групы. «Чужым» можна быць толькі ў адносінах да пэўнай абмежаванай групы. Такімі «чужымі» ў рамках пэўнага працоўнага калектыву, у вачах некаторых рабочых, і станавіліся стаханаўцы. Яны, з аднаго боку, належалі да калектыву рабочых асобнай гаспадарчай адзінкі, і ў той жа час у межах гэтай сацыяльнай групы ўспрымаліся як прадстаўнікі іншага мыслення, норм і характару паводзін, штодзённага жыцця. Працоўная дзейнасць рабочых пры ажыццяўленні кампаній стаханаўскага руху пачала рэгулявацца зверху арыентацыяй на працоўную эліту, што пры размежаванні ідэі і эканамічных магчымасцяў пераасэнсоўвалася ў адмоўны вобраз удзельнікаў руху: пры гэтым рабочыя адчувалі, што сацыяльны статус стаханаўцаў толькі ствараў падставу для дадатковай мабілізацыі працоўнай сілы, прыводзіў да абмежа-

вання ў заработнай плаце, матэрыяльным забеспячэнні, да звышнармаванай працы ў дапамогу героям вытворчасці для захавання іх рэкордаў. Так, работніца Д. з фабрыкі «КІМ» заяўляла адносна стаханаўцаў свайго прадпрыемства: «Я буду выцягваць усіх траіх, яны будуць стаханаўцамі, а я працую не менш за іх і з’яўляюся не стаханаўкай» [14, арк. 10]. Характэрнымі ў гэтым сэнсе з’яўляюцца і словы аднаго рабочага з Полацка: «Стаханаўскі рух добры толькі для асобных людзей, якія жывуць добра, астатніх рабочых душаць за кошт стаханаўцаў» [14, арк. 10].

Акрамя незадаволенасці стаханаўскім рухам і стаханаўцамі адмоўныя рэакцыі рабочых праявіліся і ў канкрэтных паводзінах пасіўнага і актыўнага характару. Пасіўныя формы сацыяльных паводзін рабочых перадаваліся ў форме байкоту, ігнаравання мерапрыемстваў, што былі звязаны са стаханаўскім рухам. Напрыклад, рабочы аднаго з віцебскіх прадпрыемстваў, член партыі, у час цэхавых мітынгаў, прысвечаных Усесаюзнай нарадзе стаханаўцаў і прамове Сталіна, адмовіўся выступаць перад астатнімі рабочымі па гэтым пытанні [14, арк. 183]. Праявы актыўных форм паводзін непрымання стаханаўскага руху былі больш разнастайныя і адлюстроўваліся перш за ўсё ў форме здзекаў і насмешак над перадавікамі вытворчасці. На Мінскай абутковай фабрыцы імя Кагановіча былі адзначаны выпадкі абразлівых адносін з боку рабочых да стаханаўца Л. [13, арк. 206]. На швейнай фабрыцы імя Дзяржынскага (Бабруйск) наконт ініцыятывы стаханаўца Я. прымяніць новыя метады ў працы цэха асобныя робочыя заявілі: «Ты не будзь выскачкай і не рабі сябе героем» [13, спр. 9040, арк. 34]. Часта такія здзекі і насмешкі перарасталі ў пашкоджанні абсталявання стаханаўцаў, падкідванні ім няякаснай сыравіны, прадукцыі і іншыя ўчынкі [13, спр. 9040, арк. 52; 14, арк. 30, 35].

**Заключэнне.** Адным з фактараў разгортвання стаханаўскага руху ў сярэдзіне 1930-х гг. стала асаблівасць успрымання яго рабочымі. Большасць рабочых успрыняла стаханаўскі рух як спрыяльную ўмову для далейшай рэалізацыі сваіх імкненняў па ўдасканаленні працы, якія ўжо зацвердзіліся ў рабочай працоўнай этыцы з першых гадоў індустрыялізацыі, такая эмацыянальная рэакцыя з’яўлялася найбольш адметнай пры ўспрыманні руху рабочымі-ўдарнікамі. Да ўключэння рабочых БССР у рух пабуджалі і сфарміраваныя прапагандай вобразы герояў-стаханаўцаў: калі вобразы вядомых на ўвесь СССР стаханаўцаў выступалі для радавых рабочых своеасаблівым эталонам дасканалай працы, то перадавікі рэспубліканскага ўзроўню ці ўзроўню асобнага прадпрыемства ўзмацнялі ўпэўненасць у рэальнасці ажыццяўлення стаханаўскіх рэкордаў і ў беларускай прамысловасці. Аднак скарыстанне адміністрацыйных метадаў, інтэнсіўная працоўная мабілізацыя, тэндэнцыя зніжэння расцэнак і павышэння норм выпрацовак пры разгортванні руху прывялі да ўзнікнення такіх псіхалагічных рэакцый у часткі рабочых, пры якіх назіралася адсутнасць матывацыі да актыўнай працоўнай дзейнасці і адмоўнае ўспрыманне стаханаўцаў.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. ***Гісторыя Беларускай ССР: у 5 т.*** / рэд. кал.: І.М. Ігнаценка (стар.) [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1972–1975. − Т. 3: Перамога Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі і пабудова сацыялізму ў БССР (1917–1937 гг.) / І.Я. Марчанка [і інш.]. – 1973. − 696 с.
2. ***Протько, Т.С.*** Становление советской тоталитарной системы в Беларуси (1917–1941 гг.) / Т.С. Протько. – Минск: Тесей, 2002. – 688 с.

3. ***Рогачевская, Л.С.*** Социалистическое соревнование в СССР: Исторические очерки. 1917–1970 / Л.С. Рогачевская. – М.: Наука, 1977. – 352 с.
4. ***Siegelbaum, L.H.*** Stakhanovism and the Politics of Productivity in the USSR. 1935–1941 / L.H. Siegelbaum. – Cambridge, 1988. − 350 p.
5. ***Maier, R.*** Die Stachanov – Bewegung. 1935–1938. Der Stahanovismus als tragendes und verschärfenfends Moment der Stalinisierung der sowjetischen Gesellschaft / R. Maier. – Stuttgart, 1990. – 441 s.
6. ***Стахановцы спиртовой промышленности БССР*** / сост. И.М. Ярмошевич. – Минск: Гос. изд-во Белоруссии, 1936. – С. 28.
7. ***Радасная праца, радаснае жыццё.*** – Мінск: Дзярж. выд-ва Беларусі, 1936. – С. 21.
8. ***Прамова тав. С.С. Быкоўскай*** // Звязда. – 1935. – 20 снежня. – С. 2.
9. ***Как я работаю (рассказ Григория Рушко)*** // Рабочий. – 1935. – 12 декабря. – С. 3.
10. ***Стаханаўцы «Камунаркі».*** – Мінск: Дзярж. выд-ва Беларусі, 1936. – С. 33–34.
11. ***Чыкун, П.*** Рыгор Рушко і яго таварышы / П. Чыкун // Звязда. – 1935. – 9 снежня. – С. 3.
12. ***За стахановскую работу на стройках.*** – Минск: Гос. изд-во Белоруссии, 1936. – С. 19.
13. ***Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь***. – Ф. 4-п. – Воп. 1. – Спр. 10776. – Арк. 166.
14. ***Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці.*** – Ф. 102. – Воп. 1. – Спр. 377. – Арк. 9.

*S U M M A R Y*

*The research is devoted to the problem of emotional perception of the Stakhanov movement by workers of the BSSR in the mid 1930s. The author considers that the movement expansion was influenced by labor values of workers and the developed system of heroism in everyday culture. In the article the principal causes and forms of display of antistakhanov moods are analyzed.*

*Поступила в редакцию 20.05.2009*